УДК [930.85+130.2](510)

# СІНАЛОГІЯ ЯК НАВУКА І ВУЧЭБНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

***А. І. Смолік,*** *доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле кітайская культура і мова разглядаюцца як праблемнае поле сусветнага гуманітарнага дыскурсу. Аналізуюцца фундаментальныя даследаванні культуры Кітая навукоўцамі заходніх краін. Адзначаецца, што значны ўклад у пераўтварэнне імпліцытных ведаў аб культуры кітайскага народа ў эксплiцытныя аб Паднябеснай унеслі расійскія кітаязнаўцы. Паказана дзейнасць беларускіх сацыяльных антраполагаў па даследаванню нацыянальнага характара, менталітэта, этаса розных супольнасцей, якія здаўна насялялі тэрыторыю сучаснага Кітая, а таксама паказана імкненне сучаснікаў глыбей пазнаць кітайскую культуру і мову. Робіцца выснова аб тым, што сёння ў культуралагічным дыскурсе сфарміравалася асобная навуковая галіна – сіналогія.
**Ключавыя словы:** даследаванні, культура, Кітай, мова, сіналогія.

# SINOLOGY AS A SCIENCE AND ACADEMIC DISCIPLINE

***A. Smolik,*** *Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines Chinese culture and language as a problem field of the World Humanitarian discourse. The article analyzes the fundamental research of Chinese culture by scientists of Western countries and notes that Russian Chinese scholars made a significant contribution to the transformation of implicit knowledge about the culture of the Chinese people into explicit knowledge about the Celestial Empire. The article shows the activities of Belarusian social anthropologists to study the national character, mentality, ethos of various communities that have long inhabited the territory of modern China, and also shows the desire of contemporaries to learn more about Chinese culture and language. It is concluded that today a separate scientific branch – sinology - has been formed in the cultural discourse.
**Keywords:** research, culture, China, language, sinology.

Кітай з’яўляецца краінай са шматвекавой гісторыяй цывілізацыі. Сярод некалькіх старажытных культур кітайская культура не знікла, а працягвае бесперапынна развівацца да цяперашняга часу і мае больш чым 5000-гадовую гісторыю. На працягу шэрагу тысячагоддзяў, амаль да пачатку прамысловай рэвалюцыі, Кітай знаходзіўся ў авангардзе сусветнай эканомікі, навукі, тэхнікі і культуры. Сёння Кітай, рэалізуючы канцэпцыю мадэрнізацыі, як адзначыў Сі Цзіньпін, «зноў дабіўся

гістарычнага прагрэсу ў сваім развіцці, па сукупнаму аб'ему эканомікі выйшаў на другое месца ў свеце» [10, с. 122].

Феномен кітайскай цывілізацыі на працягу многіх стагоддзяў знаходзіўся ў цэнтры ўвагі сусветнага гуманітарнага дыскурсу. У XIX–XX стст. пачалі з'яўляцца фундаментальныя даследаванні заходніх навукоўцаў. Асобным аспектам развіцця кітайскай культуры былі прысвечаны працы Д. Баддэ [14], Э. Т. Ч. Вернера [20], М. Гранэ [15], А. Форке [17], Б. Карлгрэна [18], В. Эберхарда [16] і інш.

Значную каштоўнасць для даследчыкаў кітайскай культуры маюць працы расійскіх кітаязнацаў, сярод якіх, на наш погляд, трэба адзначыць манаграфіі В. В. Адамчыка [2], Ю. Г. Лямешка [6], Л. С. Пераломава [8], М. Л. Цітарэнка [3], Э. М. Яншынай [13] і інш.

У сваіх даследаваннях кітайскай цывілізацыі шэраг замежных вучоных абапіраліся на крыніцазнаўчую базу і метадалогію вывучэння культур Усходне-Азіяцкага рэгіёна, у т. л. і Кітая, распрацаваную беларускімі антраполагамі, гісторыкамі і філосафамі XIX–XX стст. Так, культурная прастора Кітая на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў была аб'ектам грунтоўнага вывучэння І. А. Гашкевіча, які даследаваў духоўную і матэрыяльную культуру кітайцаў, іх мову, звычаі і абрады, гісторыю, літаратуру, мастацтва, філасофію. Матэрыялы, сабраныя ў Кітаі, паслужылі асновай для серыі публікацый у пецярбургскіх навуковых зборніках [1; 11].

На матэрыялах кітайскай рэчаіснасці з гуманістычна-пацыфісцкай пазіцыі М. К. Судзілоўскі даследаваў узаемаадносіны заходняй і ўсходняй культур як пагранічных. У працах «Западный и восточный человек», «Южный человек», «Американский индивидуализм» і інш. філосаф даказаў, што, нягледзячы на тое, што заходняя і кітайская культуры з'яўляюцца супрацьлеглымі накірункамі і перанос заходніх сацыя-культурных стэрэатыпаў на азіяцкую глебу немагчымы, дыялог культур з'яўляецца адзіным механізмам, які дазволіць пазбегнуць глабальнага канфлікта [7, с. 556–564]. Гэта ідэя не згубіла сваю актуальнасць і сёння.

Грунтоўна, без скажэння рэалій даследаваў сацыяльна-культурныя працэсы кітайскіх этнасаў В. М. Кавалеўскі. Валодаючы арабскай, кітайскай, персідскай, татарскай мовамі, ён паглыбляўся ў сутнасць нацыянальнага характара, менталітэта, рэлігійнага светапогляду, нораваў і традыцый кітайскіх этнасаў. Вынікам яго навуковай дзейнасці сталі «Краткая грамматика монгольского книжного языка», «Монгольская хрестоматия», «Монголо-русско-французский словарь» і інш. [4, с. 444].

Даследаванні кітайскай культуры працягваюцца і сёння [9; 12]. Культуру і гісторыю Кітая вывучаюць не толькі вучоныя, сіналогія ўжо даўно стала вучэбнай дысцыплінай у адукацыйных установах многіх краін свету, у т. л. і Беларусі.

Вывучэнне распаўсюджвання кітайскай мовы ў Беларусі сведчыць аб тым, што ў нашай краіне імкліва расце інтарэс да авалодання ёю. У шэрагу

беларускіх сярэдніх школ мова Паднябеснай вывучаецца ў якасці першай замежнай. Так, Цэнтр кітайскай культуры і пісьменнасці шмат год функцыянуе ў гімназіі № 12 г. Мінска. Таксама юныя мінчане маюць магчымасць вывучаць кітайскую мову ў гімназіях № 11, 18, 33, 35, 36, 40 и сярэдняй школе № 170. Як факультатыў яе выкладаюць ў мінскай гімназіі № 23. Акрамя таго ў шэрагу школ і гімназій Мінска кітайскую мову вывучаюць у рамках праграмы дадатковай адукацыі. Сёння яна ўключана ў пералік вучэбных прадметаў, якія здаюцца падчас цэнтралізаванага тэсціравання. Таксама па ёй праводзяцца спаборніцтвы на рэспубліканскай студэнцкай алімпіядзе.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў значнай колькасці беларусаў сфарміраваўся ўстойлівы інтарэс да кітайскай культуры і мовы як ядру краіны і сродку сацыякультурнай камунікацыі. Гэтым, на наш погляд, абумоўлена стварэнне ў 2018 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце першага ў Беларусі факультэта кітайскай мовы і культуры, дзе ажыццяўляецца падрыхтоўка выкладчыкаў, перакладчыкаў і спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі ў сферы знешнеэканамічных сувязей. Супрацоўнікі факультета падтрымліваюць цесныя кантакты з Усходне-Кітайскім педагагічным універстэтам, Пекінскім універсітэтам замежных моў, Тяньцзіньскім універсітэтам замежных моў, Шанхайскім універсітэтам замежных моў.

Такім чынам, магчыма канстатаваць, што ў сусветных гуманітарных ведах сфарміравалася асобная навука – сіналогія. У энцыклапедычным слоўніку «Культуралогія» яна трактуецца як гуманітарная навука аб кітайскай культуры, мове, літаратуры і гісторыі Кітая [11].


1. *Аба Масами.* Хакадатэтюсацу Роккурёдзи Гасукэвити (Гошкевич, русский посол в Хакадатэ) / Аба Масами. – Токио : Рэкиситири, 1920. – С. 141–146. – Текст на яп. яз.

2. *Адамчик, В. В.* История Китая / В. В. Адамчик. – М. : АСТ, 2007. – 736 с.

3. Духовная культура Китая : энцикл. : в 5 т. / гл. ред. М. Л. Титаренко ; Ин-т Дальнего Востока РАН. – М. : Вост. лит., 2006–2010. – Т. 3 : Литература. Язык. Письменность / ред. М. Л. Токарев [и др.]. – 2008. – 855 с.

4. Кавалеўскі Восіп Міхайлавіч (1800–78) // Мысліцелі і асветнікі Беларусі / Беларус. Энцыкл. ; Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 444.

5. *Казакова, І. В.* Беларускія і кітайскія традыцыйныя культуры: параўнальны аспект / І. В. Казакова. – Мінск : Паркус плюс, 2014. – 150 с.

6. *Лемешко, Ю. Г.* Искусство народной картины – няньхуа как часть нематериального культурного наследия Китая / Ю. Г. Лемешко // Проблемы Дал. Востока. – 2013. – № 4. – С. 160–163.

7. *Оргіш, В. П.* Судзілоўскі Мікалай Канстанцінавіч (псеўд. Русель; 15.12.1850–30.4.1930) / В. П. Оргіш // Мысліцелі і асветнікі Беларусі / Беларус. Энцыкл. ; Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 556–564.

8. *Переломов, Л. С.* Слово Конфуция / Л. С. Переломов. – М. : Фабула, 1992. – 191 с.

*9. Рудман, У.* Новая літаратура кітайскага народа / У. Рудман // Полымя. – 1950. – № 5. – С. 106–114.

*10. Си Цзиньпин.* Речь в колледже Европы в Брюгге / Си Цзиньпин // О создании сообщества единой судьбы человечества. – Пекин : Чжунъян бяньи чубаньшэ, 2021. – С. 122. – На кит. яз.

*11. Хоруженко, К. М.* Синология / К. М. Хоруженко // Культурология : энцикл. слов. – Ростов н/Д : Феникс, 1993. – С. 37–38.

*12. Шиманский, М. Н.* Китай с открытым сердцем / М. Н. Шиманский. – Минск : Парадокс, 2002. – 351 с.

*13. Яншина, Э. М.* Формирование и развитие древнекитайской мифологии / Э. М. Яншина. – М. : Наука, 1984. – 248 с.

*14. Bodde, D.* Myths of Ancient China / D. Bodde // Mythologies of the Ancient World / ed. S. N. Kramer [et al.]. – 1961. – P. 360–408.

*15. Granet, M.* Étudessociologiques sur la Chine / M. Granet. – Paris : Presses Univer. de France, 1953. – XX, 301 p.

*16. Eberhard, W.* Lokalkultrenin Chinal. Die Lokalkultren des Nordens und Westens / W. Eberhard. – Leiden : Brill, 1942. – 447 s.

*17. Forke, A.* The World – Conception of the Chinese: Their Astronomical, Cosmological and Physico-Philosophical Speculations / A. Forke. – London : Probsthain, 1925. – XIV, 300 p.

*18. Karlgren, B.* Legendes and Cults in Ancient China / B. Karlgren // Bull of Museum of Far Eastern Antiquities. – 1946. – Vol. 18. – P. 199–365.

*19. Maspero, A.* Legendes mythology quesdans le Chou king / A. Maspero // J. Asiat. – 1924. – Vol. 204, Jan.–Mars. – P. 1–100.

*20. Werner, E. T. C.* Myth and Legends of China / E. T. C. Wener. – New York : Blom, 1971. – 453 p.